Жанна Раманава

# Сучасныя падыходы да азначэння тэрміна «інфармацыйныя рэсурсы»

З сярэдзіны XX стагоддзя пачаўся новы этап у развіцці сусветнай цывілізацыі. Гэта звязана з пачаткам эпохі інфарматызацыі ўсіх сфер жыццядзейнасці чалавецтва і фарміраваннем інфармацыйнага грамадства. Галоўным кампанентам інфармацыйнага грамадства, які вызначае ступень яго сацыяльна-эканамічнага развіцця і інтэлектуальнага патэнцыялу, стратэгічным рэсурсам становіцца інфармацыя, а яе вытворчасць і спажыванне на аснове новых інфармацыйных тэхналогій – важнейшым відам дзейнасці.

У сувязі з тым, што інфармацыйныя рэсурсы сталі дамінуючым фактарам сусветнага развіцця, свайго роду гарантам стабільнасці грамадства, узнікла неабходнасць вызначэння сутнасці гэтага паняцця, яго аб'ёму і зместу.

Першыя спробы даць азначэнне інфармацыйных рэсурсаў былі зроблены ў 90-я гг. XX стагоддзя, калі афарміўся так званы «рэсурсны падыход» да вывучэння інфармацыі. На сённяшні час тэрмін «інфармацыйныя рэсурсы» з'яўляецца агульнаўжывальным. Але ж, нягледзячы на гэта, дакладнага азначэння яго няма.

Існуе шырокая і вузкая трактоўка інфармацыйных рэсурсаў. У шырокім сэнсе прапануецца разглядаць іх як веды, падрыхтаваныя людзьмі для сацыяльнага выкарыстання ў грамадстве і зафіксаваныя на матэрыяльным носьбіце. У вузкім сэнсе пад інфармацыйнымі рэсурсамі разумеюць толькі сеткавыя рэсурсы, даступныя праз камп'ютэрныя сродкі сувязі. Але ад таго, як трактуюцца інфармацыйныя рэсурсы, залежыць не толькі тэорыя прадмета, але і практычная дзейнасць.

У беларускім заканадаўстве знайшла адлюстраванне трактоўка інфармацыйных рэсурсаў у вузкім значэнні. Так, Закон Рэспублікі Беларусь «Об информатизации» азначае інфармацыйныя рэсурсы як «арганізаваную сукупнасць дакументаванай інфармацыі, якая ўтрымлівае базы дадзеных і ведаў, іншыя масівы інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах». Аналагічная трактоўка цікавага для нас паняцця даецца і ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь». Як бачым, пад інфармацыйнымі рэсурсамі ў гэтых дакументах разумеюцца толькі электронныя інфармацыйныя рэсурсы. У вузкім сэнсе інфармацыйныя рэсурсы трактуюцца і ў Пастанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «О государственной регистрации информационных ресурсов», дзе да інфармацыйных аднесены рэсурсы, прадстаўленыя ў форме баз даных, баз ведаў, банкаў даных і іншай форме, якая дае магчымасць іх апрацоўкі з дапамогай электронна-вылічальнай тэхнікі.

Азначэнне інфармацыйных рэсурсаў у афіцыйных дакументах толькі як электронных рэсурсаў на практыцы прыводзіць да непаразуменняў і блытаніны, бо ад таго, які змест укладаецца ў дадзенае паняцце, залежыць іх кампанентная структура. У якасці прыкладу можна прывесці першы выпуск каталога пад назвай «Информационные ресурсы Беларуси», выдадзенага ў 2002 г. у Мінску. Зыходзячы з яго назвы, лагічна дапусціць, што ў ім будуць адлюстраваны ўсе віды рэсурсаў: як электронныя, так і друкаваныя. Але аказваецца, што складальнікі разумеюць пад інфармацыйнымі рэсурсамі толькі электронныя, і менавіта іх адлюстравалі ў гэтым каталозе. Такім чынам у назве выкарыстоўваецца шырокае паняцце, а ў змесце каталога адлюстроўваюцца інфармацыйныя рэсурсы толькі ў вузкім значэнні.

У больш шырокім значэнні інфармацыйныя рэсурсы трактуюцца ў расійскім заканадаўстве. Так, напрыклад, Закон Расійскай Федэрацыі «Об информации, информатизации и защите информации» пад інфармацыйнымі рэсурсамі разумее «асобныя дакументы і асобныя масівы дакументаў у інфармацыйных сістэмах (бібліятэках, архівах, фондах, банках даных і іншых інфармацыйных сістэмах). Але і такая трактоўка выклікала крытыку з боку Ю.М. Сталярова [12, с. 18–20], які заўважыў, што тут інфармацыйныя рэсурсы ўяўляюць сабой толькі дакументы і іх масівы і нічога акрамя таго. Таму ён прапанаваў ужыванне тэрміна «дакументныя рэсурсы» замест «інфармацыйныя рэсурсы» як больш дакладнага, што раскрывае змест гэтых рэсурсаў – змешчаную ў іх інфармацыю і яе матэрыяльнае ўвасабленне.

Паводле міждзяржаўнага стандарта «Информационно-библиотечная деятельность. Библиография. Термины и определения» (2000 г.), інфармацыйныя рэсурсы – гэта «сукупнасць дадзеных, арганізаваных для эфектыўнага атрымання дакладнай інфармацыі». Гэтае азначэнне таксама крытыкавалася ў працах Ю.М.Сталярова [12, с. 17–18], які палічыў, што і тут «інфармацыйныя рэсурсы» і «дакументныя рэсурсы» выступаюць як сінанімічныя паняцці.

Разнабой у азначэнні інфармацыйных рэсурсаў існуе і ў даведачнай і навуковай літаратуры. «Терминологический словарь по библиотечному делу и смежным отраслям знания» [13, с. 76] трактуе інфармацыйныя рэсурсы як «трэці, важнейшы від рэсурсаў сучаснага грамадства (разам з матэрыяльнымі і энергетычнымі), які забяспечвае збор, апрацоўку, захаванне, пошук і выкарыстанне інфармацыі». У гэтай дэфініцыі не ўдакладняецца, з чаго складаецца дадзены від рэсурсаў, а толькі ўказваецца, для чаго яны прызначаны [15, с. 200].

Тэрміналагічны слоўнік «Библиотечное дело» [1, с. 48] вызначае інфармацыйныя рэсурсы як сукупнасць інфармацыйных даных на традыцыйных і машыначытаемых носьбітах, якія захоўваюцца ў бібліятэках і іншых інфармацыйных установах і складаюць інтэлек-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

туальны і матэрыяльны патэнцыял, што выкарыстоўваецца для задавальнення інфармацыйных патрабаванняў грамадства. Як слушна заўважыла Г. Швяцова-Водка [15, с. 200], сумненне тут выклікае словазлучэнне «інфармацыйныя дадзеныя». А ці могуць дадзеныя быць неінфармацыйнымі? Па азначэнню гэтага ж слоўніка, дадзеныя – гэта «інфармацыя, прадстаўленая ў фармалізаваным выглядзе». Такім чынам, інфармацыйныя рэсурсы тут разумеюцца як «інфармацыя, прадстаўленая ў фармалізаваным выглядзе».

«Справочник библиографа» [11, с. 60] азначае інфармацыйныя рэсурсы як «існуючыя запасы інфармацыі, зафіксаванай на якім-небудзь носьбіце і прыгоднай для яе захавання і выкарыстання». У дадзеным азначэнні, як і ў папярэднім, інфармацыйныя рэсурсы разумеюцца ў шырокім сэнсе і дэфініруюцца праз паняцце «інфармацыя». Але ж само паняцце «інфармацыя» з'яўляецца дыскусійным і мае больш за 300 азначэнняў. Таму, на наш погляд, было б не зусім правільным дэфініраваць адно недакладнае паняцце праз другое, такое ж недакладнае.

Наступнае азначэнне, дадзенае ў «Толковом словаре по основам информационной деятельности» [14, с. 80], гучыць так: «Інфармацыйныя рэсурсы – сукупнасць дадзеных, якія ўяўляюць сабой каштоўнасць для ўстановы (прадпрыемства) і выступаюць у якасці матэрыяльных рэсурсаў. Да іх адносяцца асноўныя і дапаможныя масівы дадзеных, якія захоўваюцца ў знешняй памяці, і ўваходныя дакументы». У гэтым азначэнні інфармацыйнымі лічацца толькі рэсурсы, якія маюць каштоўнасць для ўстановы. Атрымліваецца, што ў іншым выпадку яны ўжо перастаюць быць інфармацыйнымі. На наш погляд, паняцці «інфармацыйныя» і «каштоўныя» не з'яўляюцца сінонімамі і не могуць замяняцца адно адным. Незразумела таксама, як дадзеныя могуць выступаць у якасці матэрыяльных рэсурсаў? Выходзіць, што інфармацыйныя рэсурсы – гэта матэрыяльныя рэсурсы, што зусім не так. І апошняе. Не ясна, чаму інфармацыйнымі рэсурсамі называюцца толькі тыя, якія захоўваюцца ў знешняй памяці, а як жа дадзеныя, што захоўваюцца ва ўнутранай памяці? Яны ўжо не інфармацыйныя рэсурсы? Як бачым, гэтае азначэнне больш выклікае пытанні, чым раскрывае сутнасць інфармацыйных рэсурсаў [15, с. 200].

Некаторыя аўтары дэфініруюць інфармацыйныя рэсурсы праз паняцце «веды». Напрыклад, Н.Б.Зіноўева [2, с. 87] лічыць, што інфармацыйныя рэсурсы – гэта веды, зафіксаваныя на матэрыяльных носьбітах, інакш кажучы, ствараемая інтэлектуальнай дзейнасцю людзей сацыяльная інфармацыя.

Аўтары «Основ теоретической информатики» [5, с. 21–24] лічаць, што інфармацыйныя рэсурсы – гэта сімбіёз ведаў і інфармацыі (дзе інфармацыя выступае ў якасці паняційных ведаў).

На аснове вышэйсказанага можна зрабіць выснову, што ў большасці крыніц пад «інфармацыйнымі рэсурсамі» разумеецца наступнае: 1) электронныя рэсурсы; 2) інфармацыя; 3) сукупнасць дакументаў; 4) веды, зафіксаваныя на матэрыяльных носьбітах. На наш погляд, апошняе азначэнне паняцця «інфармацыйныя рэсурсы» з'яўляецца найбольш дакладным. Гэтая пазіцыя грунтуецца на тым, што веды – гэта не проста інфармацыя ўвогуле, а «інфармацыя, якая атрымана ў адпаведнасці з якімі-небудзь крытэрыямі, пэўным чынам упарадкавана, аформлена, мае сацыяльнае значэнне і прызнаецца ў якасці ведаў пэўнай сацыяльнай групай або грамадствам у цэлым» [6, с. 12]. Веды існуюць у свядомасці кожнага чалавека, але для таго, каб яны пераўтварыліся ў інфармацыйныя рэсурсы, неабходна іх фіксацыя на якім-небудзь матэрыяльным носьбіце. Гэта робіць магчымым іх трансляцыю і выкарыстанне ў соцыуме, што з'яўляецца неабходнай умовай для існавання інфармацыйных рэсурсаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Библиотечное дело: Терминологический словарь / Рос. гос. б-ка. – М., 1997. – С. 48.
2. Зиновьева Н.Б. Информационная культура личности: Введение в курс: Учеб. пособие. – Краснодар, 1996. – 136 с.
3. Информационно-библиотечная деятельность. Библиография. Термины и определения: ГОСТ 7.0-99. – М., 1999. – 12 с.
4. Информационные ресурсы Беларуси: Каталог. Вып. 1 / Сост. Агафонов В.Н. и др. – Мн.: УП «НИПТИ информатизации», 2002. – 84 с.
5. Каныгин Ю.М. Основы теоретической информатики / Каныгин Ю.М., Калитич Г.И. – Киев: Наук. думка, 1990. – 231 с.
6. Кузьмініч Т.В. Інфармацыйная культура асобы: Вучэбны дапаможнік. – Мн., 2002. – 168 с.
7. О Государственной регистрации информационных ресурсов: Постановление Совета Министров Республики Беларусь, 28 августа 2000 г. № 1344 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2000. – № 84, 5/3953.
8. Об информатизации: Закон Республики Беларусь от 6 сентября 1995. – № 3850-XII // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. – 1995. – № 33. – С. 428.
9. Об информации, информатизации и защите информации: Федеральный закон. Принят Гос. Думой 25 января 1995 г. – Любое издание.
10. Леончиков В.Е. Информационные ресурсы. Теоретический аспект // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне: Матэр. міжнар. нав.-практ. канф. (23 – 26 мая 2000г., г. Мінск). – С. 62–65.
11. Справочник библиографа / Науч. ред.: А.Н. Ванеев, В.А. Минкина. – Спб.; Профессия, 2002. – 528 с. – (Серия «Библиотека»).
12. Столяров Ю.Н. Документный ресурс: Учеб. пос. для студ. выс. учеб. зав. – М.: Либерия, 2001. – 149 с.
13. Терминологический словарь по библиотечному делу и смежным отраслям знания. – М.: Б-ка по естественным наукам РАН, 1995. – 126 с.
14. Толковый словарь по основам информационной деятельности / Укр. Акад. информатики. Укр. ин-т науч.-техн. и экон. информ.; Под. ред. Н.Н. Ермошенко. – Киев, 1995. – С. 80.
15. Швецова-Водка Г. Изучение библиографических ресурсов в курсе общего библиографоведения // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне: Матэр. міжнар. нав.-практ. канф. (23–26 мая 2000 г., г. Мінск ). – С. 199–203.



Summary

The article «Modern Approaches to Defining the Term «information resources»deals with the analysis of various interpretations of the notion «information resources»found in the works of academics majoring in information and bibliographic activities and document researchers as well as in the legislation of the Republic of Belarus and the Russian Federation. The author takes a comprehensive view at the existing theoretical and legal approaches towards defining the notion «information resources»and attempts to formulate her position on the issue considering that «information resources»are perceived as knowledge described on material carriers.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ